1/2 нумара № 45

ПЕСНЯ—ДУША НАРОДА

Калі мы ўвайшлі ў сяло Дзяляцічы, нам сустрэўся калгаснік.

— Дзень добры, дзядзька!

— Дзень добры.

— Як нам тут знайсці кіраўніка вашага хору Радаліцкага?

— Кіраўніка нашай капелы,—паправіўшы нас, з гонарам сказаў дзядзька. — Дайдзеце да магазіна, там спытаеце.

Для нас было навіной тое, што Міністэрства культуры БССР прысвоіла Дзяляціцкаму самадзейнаму хору назву капелы. Калі вечарам сабраўся хор і праспяваў свае песні, мы пераканаліся ў тым, што гэта сапраўдны акапельны хор, які можа спаборнічаць з прафесіянальным калектывам. Пачуццё ансамбля, чысціня інтанацыі, чатырохгалосае спяванне, дакладная перадача нюансаў, — гэта паказчыкі высокай музычнасці хору.

— Павел Аляксандравіч! — звярнуліся мы да кіраўніка Радаліцкага. — Раскажыце нам аб вашай працы, аб калектыве.

— Што-ж расказваць, бачыце самі. Дзяляціцкі хор — адзін з самых старэйшых самадзейных калектываў рэспублікі.

Узнікшы 30 год назад як сялянскі хор, калектыў прайшоў вялікі творчы шлях. Яго ўдзельнікі цяпер ужо немаладыя людзі. Гэта — Якаў Сямяшкаў, Сцяпан Бесараб, Іван Клімовіч, Аляксандр Бушма і яго жонка Клаўдзія, яе сястра Ганна, Іван Трубка і іншыя.

У сяброўскай гутарцы яны расказалі аб узнікненні хору і першых гадах яго існавання. У Дзяляцічах з даўніх часоў любяць спяваць песні. Калісьці гэта былі песні сумныя, журботныя. Столькі ў іх было горкай праўды аб цяжкай долі селяніна, што, спяваючы песні, людзі плакалі.

Пасля грамадзянскай вайны дзяляціцкая моладзь з надзеяй глядзела на Усход, дзе совецкі народ будаваў новае, шчаслівае жыццё і спяваў іншыя песні. Да лета 1920 года ў хоры ўдзельнічала 20 чалавек з ліку сялянскай моладзі. Рэпертуар папаўняўся песнямі, якія ўдалося ўпотай падслухаць па радыё з Совецкага Саюза. (Іх у Заходняй Беларусі называлі «слуханкамі»). Запаміналіся яны лёгка і вельмі хутка распаўсюджваліся сярод насельніцтва.

У чэрвені 1926 года паслухаць першае выступленне хору сабраліся ўсе жыхары вёскі. Выконвалася ўсё лепшае, што было ў рэпертуары.

Да 1932 года калектыў значна вырас. Усё часцей па навакольных вёсках сяляне збіраліся на тайныя сходы. Комуністы-падпольшчыкі прыносілі лістоўкі, чыталі «Праўду», расказвалі аб жыцці людзей у Совецкай Беларусі. У рэволюцыйных сходах удзельнічалі дзяляціцкія харысты — А. Зайка, П. Зайка і іншыя. На гэтых сходах рэволюцыйныя песні гучалі звонка. Для большай выразнасці выкананне многіх песень у той час «тэатралізавалася».

Калгасніца Ганна Трубка, якая спявае ў хоры з 1933 года, успамінае:

«Вясной 1933 года мы давалі канцэрт у нашай вёсцы. У праграме была песня «Ідуць касцы». Выконваючы апошні куплет, харысты нечакана ўзяліся за сярпы і косы, якія былі пакладзены на сцэне, і, узняўшы іх высока над галавой, дружна закончылі песню. Кулакі і шляхцічы, якія знаходзіліся ў зале, спалохаліся, а сяляне нашай вёскі з захапленнем слухалі родную музыку».

У верасні 1939 года хор упершыню ўдзельнічаў у раённай алімпіядзе ў Любчы і абласной — у Баранавічах, дзе заняў першае месца. Калектыў часта выступаў з канцэртамі, творча ўзмацнеў і вырас.

У змрочныя гады гітлераўскай акупацыі сціхлі песні роднага краю. Але яны жылі ў партызанскіх атрадах, у зямлянках, а яшчэ больш — у сэрцах народных спевакоў.

Прыйшоў 1944 год. Заняткі хору пачаліся адразу пасля вызвалення Дзяляціч. Колькасць яго ўдзельнікаў павялічылася да 20 чалавек. У 1947 годзе на абласным аглядзе ў Баранавічах з'яўленне на сцэне невялікай групы спевакоў з глухой вёскі выклікала ў некаторых гледачоў жарты. Харыстамі авалодала нясмеласць і разгубленасць. Яны не ведалі, як пачаць выступленне. Нечакана ў зале пагасла святло, і ў цемнаце хор дружна заспяваў песню. Праз некалькі хвілін, калі святло запалілася, уся зала і члены журы з велізарнай увагай слухалі зладжанае чатырохгалосае спяванне. Калі заслона закрылася, на сцэну прыйшлі члены журы. Сярод іх быў Г. Цітовіч.

Г. Цітовіч з таго часу стаў частым госцем у Дзяляцічах і актыўна дапамагаў хору ў яго творчым працэсе. На рэспубліканскім аглядзе сельскай мастацкай самадзейнасці ў 1951 годзе калектыў заняў першае месца.

Вялікія клопаты аб людзях і іх культурным росце праяўляе старшыня калгаса К. Саўчанка. Раней аб дзяляціцкіх калгасніках гаварылі: «Яны толькі спяваць добра ўмеюць, а ў калгасе працуюць дрэнна». У гэтых словах была праўда. Калгас «Сцяг Совецкаў» па вытворчых паказчыках быў у ліку адстаючых у раёне. Але К. Саўчанка заўсёды верыў, што людзі, якія так любяць спяваць, могуць і павінны ўзняць прадукцыйнасць працы, дабіцца лепшай аплаты свайго працадня і вывесці калгас у лік перадавых. Гэтая вера яго спраўдзілася.

У сучасны момант многа ўдзельнікаў хору з'яўляецца перадавікамі працы. З 98 удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1955 года 20 чалавек харыстаў. У Дзяляцічах гавораць цяпер: «Мы працаваць умеем таксама добра, як і спяваць». Лепшыя калгаснікі атрымалі ўрадавыя ўзнагароды. За мінулы год калгас атрымаў звыш двух мільёнаў рублёў прыбытку, і праўленне калгаса выдаткавала 10 тысяч рублёў на інструменты для народнага аркестра і касцюмы для хору.

Характэрнымі рысамі таленавітага калектыву з'яўляюцца пачуццё ансамбля, чысціня інтанацыі, багацце нюансаў. Высокая культура, любоў выканаўцаў да песні складаюць невычарпальную крыніцу для далейшага творчага росту хору. Усё часцей у Дзяляцічах можна пачуць такія размовы: «Разбагацеем, дык праз гадок—другі адкрыем музычную школу ў калгасе, няхай дзеці вучацца музыцы». Ведаючы энергію дзяляціцкіх калгаснікаў, можна спадзявацца, што музычная школа ў калгасе «Сцяг Совецкаў» сапраўды будзе.

У рэпертуары хору шмат песень беларускіх кампазітараў: «Песня аб партыі» І. Кузняцова, «Лясная песня» Ул. Алоўнікава, «Ой, пайду я, выйду» І. Любана, беларускія і польскія народныя песні.

П. Радаліцкі расказаў нам аб Дзяляціцкай харавой капеле і нічога не сказаў аб сабе. Але і ён заслугоўвае шчырага слова. Павел Аляксандравіч пасля заканчэння Кіеўскай кансерваторыі па класу скрыпкі і харавога факультэта яе шмат год іграў у сімфанічным аркестры Кіеўскай філармоніі. Пасля вайны П. Радаліцкі пераехаў у Беларусь і працаваў педагогам у Гродзенскім музычным вучылішчы. Спачатку ён быў шэфам Дзяляціцкага хору і наведваў яго толькі часам-часу. Такая работа не задавальняла ні яго, ні тым больш хор. Пазней Павел Аляксандравіч зусім пакінуў Гродна і пачаў жыць у Дзяляцічах. «Вельмі тут людзі харошыя, без іх жыць мне цяжка»,—гаворыць ён. Мы ад шчырага сэрца вітаем добры пачын Паўла Аляксандравіча і жадаем яму і хору вялікіх творчых поспехаў.

Адам РУСАК.

В. І. Ленін у Кастрычніцкія дні дае распараджэнне матросам Балтыйскага флоту заняць тэлефонную станцыю.
З рысунка мастака **П. Васільева.** (Фотахроніка ТАСС).

Пятрусь БРОЎКА

НОВЫЯ ВЕРШЫ

ЯК ЛІСТ ДУБОВЫ...

Не страшна мне
Ні твань, ні багна,
Ані віхуры гул і свіст —
Я за жыццё схапіўся прагна,
Як за галлё
Дубовы ліст.

Па восені
Мядзяны, дужы,
Між хмурай етыні ён гарыць...
Трасуць яго вятры і сцюжы,
А ён адно ў адказ —
Звініць.

Калі ўзіму
Мятлюга грае
І злосны шчэрыцца мароз,
Ён як далонню прыкрывае
Галінку тую,
Дзе прарос.

І толькі ў ясны дзень
Вясновы,
Калі красуе ўсё вакол —
Перад лістком зялёным, новым
Ён ціха падае
На дол.

СЭРЦА

Чырвоны камочак.
Ну, што ў ім, здаецца, —
Трапечацца-ж,
б'ецца,
спачыну не знае...
Калі прыгадаеш, маленькае сэрца, —
Чаго яно толькі ў сабе не змяшчае?
Шмат дзён перажытых
І хмурых і ясных,
І моры, і горы,
і рознага многа...
А я вось даўно, ад маленства выразна,
Праз сэрца сваё адчуваю дарогу.
Ляжыць яна роўнай
Стралою нібыта,
То раптам, як стужка,
закружыць,
заўецца —
Чым далей іду я, чым больш перажыта—
Тым больш успамінаў на ёй застаецца.
Ёсць людзі,
Што ў сэрцы сябрамі гасцілі,
Прайшлі той дарогай
хвіліну якую,
Прайшлі яны, дрэўцы на ёй пасадзілі,
А тыя цвітуць і цвітуць, і красуюць.

А ёсць і такія,
Што носячы камень,
Стараюцца кінуць,
між іншым,
як быццам, —
Усцеляць дарогу згрызот валунамі,
Змагаецца сэрца, каб як іх пазбыцца.

Балюча бывае,
Што засяцца вочы,
Нямала іх здолела
цяжка параніць —
Кідаюся хворы на ложку праз ночы,
Але з перамогай страчаю світанне.

Хай твар мой,
Бывае, збялее, што кужаль,
Днём новым я лекі знаходжу,
іх мноства —
І зноўку выходжу бадзёры і дужы,
І сэрца раскрыта маё для сяброўства.

ДУША ВЕЧНАЙ МЕРЗЛАТЫ

Масіўчы, гладкі ён мужчына,
Надзейны страўнік, моцны сон,
На твары жаднае маршчыны
Пад сорак год не знае ён.

Спытайце што — адкажа з толкам:
Ён знае ўсё, аб чым не йшло...
Заўжды апранены з іголкі,
Хоць у вітрыну стаў за шкло.

Не разнервуецца дарэмна,
Не возьме ў рот таго-сяго...
Ва ўсіх адносінах прыемны —
Я чуў, казалі пра яго.

Такі крыштальны, аж свіціцца,
Ледзь не зрабілі ўжо святым...
А як мне з гэтым пагадзіцца,
Бо я дазнаўся, вось аб чым:

У дзень вясновы, не рабочы,
(Бо парушальнікам не быў),
Ішоў ля рэчкі ён аднойчы,
З развагаю паветра піў —

У думках шчасце сваё множыў,
Здабыткам дбайны вёў падлік...
І раптам з рэчкі патрывожыў
Яго спакой дзіцячы крык.

Зірнуў, узважыў — там глыбока,
Дуроных выляў дзяцей,
Гукнуў міліцыю здалёку,
А сам пайшоў, пайшоў далей.

Над гэтым шмат я ў думках біўся,
І пагадзіўся толькі з тым,
Што ўзяць з такога,
Ён радзіўся
З душою вечнай мерзлаты.

Самадзейны артыст

Гэта было гады чатыры таму назад. У невялічкім пакойчыку Мядзельскага раённага дома культуры сабраліся самадзейныя артысты, каб пачаць рэпетыцыю п'есы «Калінавы гай». Ветэрынарны фельчар мясцовай ветэрынарнай лячэбніцы Анатоль Дыман — выканаўца ролі матроса Ветравога — з'явіўся апошнім.

— *Даруйце,—заявіў ён адразу, як толькі пераступіў парог,—сёння ў мяне часу няма...* А заўтра маё дзяжурства. А там, магчыма, на тыдзень паеду ў калгасы раёна. Дык вы тут без мяне...

Ён цвёрда быў упэўнены, што ў вызначаны час выступіць на сцэне і не падвядзе свой самадзейны калектыў.

І сапраўды, Анатоль вярнуўся са сваёй паездкі па раёну і пасля адной генеральнай рэпетыцыі здолеў перадаць на сцэне запамінальны вобраз матроса Ветравога.

Часта бывае, што ў той час, калі ў драмгуртку ідзе рэпетыцыя новай п'есы, А. Дыман знаходзіцца ў самых аддаленых калгасах раёна. Там ён шукае характэрныя дэталі для сваіх будучых вобразаў.

— Каб не ўласныя навіранні, мне цяжка было-б перадаць на сцэне вобраз брыгадзіра Арлова ў спектаклі «Вяселле з пасагам»,—прызнае сам Анатоль Венядзіктавіч.

За дзесяць год працы на самадзейнай сцэне А. Дыман прымаў удзел у пастаноўцы такіх п'ес, як «У бэзавым садзе», «Таня», «Капітан у адстаўцы», «Сям'я», «За другім фронтам», «Я хачу дамоў» і інш.

Анатоль добра знаёмы з рускай, беларускай і украінскай класічнай драматургіяй. Асабліва прыцягваюць яго ўвагу персанажы з п'ес М. Горкага і А. Чэхава.

Хочацца сказаць некалькі слоў і аб самім драматычным гуртку Мядзельскага раённага дома культуры. Гэта адзін са старэйшых мастацкіх калектываў вобласці. Яго спектаклі не раз ішлі з поспехам не толькі на мясцовай сцэне і ў калгасах свайго раёна, але і ў Вілейцы, Крывічах, Свіры, а таксама на абласных і рэспубліканскіх аглядах мастацкай самадзейнасці. Былыя ўдзельнікі гуртка Т. Шашкіна, М. Захарэвіч, Я. Шабан сёння вучацца ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. Доўгі час тут на самадзейнай сцэне працуюць планавік мясцовага промкамбіната Л. Трубач, служачы К. Зацаркляны, медыцынская сястра Р. Чарняўская, работнік райкома партыі Я. Загорская і інш.

Да Кастрычніцкіх свят драматычны калектыў пад кіраўніцтвам Зосі Ходас рыхтуе спектакль па п'есе «У добры час!», у якім галоўныя ролі выконваюць А. Дыман і яго сябры па сцэне.

А. МАХНАЧ.

МУЖНЫЯ ЛЮДЗІ

Споўнілася 20 год з дня ўтварэння славутай інтэрнацыянальнай брыгады імя Яраслава Дамброўскага. У склад гэтай брыгады ўваходзілі, акрамя польскіх добраахвотнікіх батальёнаў, таксама украінскі батальён імя Тараса Шэўчэнкі і яўрэйская рота імя Ботвіна, якія папаўняліся галоўным чынам ураджэнцамі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Польскія добраахвотнікі з 1936 па 1938 год выдавалі свой рукаваны орган — газету «Забраволец свабоды», якая таемна завозілася на радзіму ў бібліятэцы Акадэміі навук Літоўскай ССР захоўваецца нумароў 10—15 гэтай газеты. У 12 нумары газеты за 1938 год змешчана героіка-рамантычная паэма Яна Выкі.

Рэволюцыйнай рамантыкай і сокароднасцю дыхаюць не толькі паэтычныя творы, але і опісы, напісаныя рукой радных байцоў. Яны расказваюць пра баявыя дні брыгады, пра маадданасць і гераізм яе байцоў. Асабліва багаты назіраннямі рэпартаж Юркі Велікановіча, напісаны са шпіталя ў Барселоне. Аўтар дзеліцца ўспамінамі аб сваіх баявых сябрах з батальёна імя Тараса Шэўчэнкі.

Батальёнам гэтым камандаваў малады хлопец, беларус па нацыянальнасці, Станіслаў Тамашэвіч. Родам ён быў з Совецкай Беларусі, але прайшоў шматгадовую школу падпольшчыка ў Заходняй Беларусі і Польшчы. У газеце за 1 мая 1938 года (№ 12) гаворыцца, што «Стась складаў планы, як стварыць беларускі батальён». Але, на жаль, яму не давялося ажыццявіць свой план. У адным з баёў Станіслаў загінуў, пакінуўшы аб сабе светлую памяць у сэрцы байцоў. Яны напісалі аб сваім любімым камандзіру артыкул-некролаг, з якога паўстае высокародны, мужны вобраз беларускага хлапца, які аддаў сваё жыццё служэнню вялікай ідэі комунізма.

Станіслаў Тамашэвіч быў не адзіным заходнебеларускім падпольшчыкам, які добраахвотна пайшоў дапамагаць іспанскаму народу ў яго барацьбе супраць фашызма. Дзесьці ў Каталоніі, пад Ларыдай, загінуў сакратар ЦК ЛКСМЗБ Пятро Дворкін, чалавек вялікай душы, светлага розуму, нязломнага характару. І шмат іншых выхаванцаў партыі і комсамола стаяла тады з вінтоўкай у руках, абараняючы цывілізацыю ад фашысцкага дзікунства.

Але што ведае аб іх грамадскасць? Комсамол Беларусі выхаваў нямала вучоных-гісторыкаў і пісьменнікаў, але не дачакаўся ад іх хоць-бы папулярнага нарысу сваёй гісторыі. Хацелася-б, каб у гісторыі комсамола Беларусі (яна ўсё-ж некалі будзе напісана) знайшлася старонка для Тамашэвіча, Дворкіна і іншых незаслужана забытых імён. Варта было-б беларускім комсамольскім газетам арганізаваць збор і публікацыю ўспамінаў як былых добраахвотнікаў антыфашысцкай вайны ў Іспаніі, так і людзей, якія ведалі тых, каго няма ўжо ў жывых.

Мужная барацьба іспанскіх патрыётаў за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы ў свой час моцна хвалявала нашых беларускіх пісьменнікаў. Я. Купала напісаў верш «Іспанія будзе свабоднай», Я. Колас — верш «Гераічная Іспанія», Э. Самуйлёнак — апавяданне «Урачыстая меса», В. Таўлай—паэму «Таварыш».

М. Танк, які жыў у той час у Вільні, запісаў у верасні 1936 года ў дзённіку: «Ідзеш па вуліцы... неяк падсвядома прыслухоўваешся да крыку газетчыкаў, і кожная вестка з іспанскага фронта хвалюе. Пераклаў з польскага «Іспанскую баладу» Эдварда Шымаскага». А ў другім месцы: «Праз Іспанію не будзе за што купіць хлеба — усё на газеты». (Дзённік захоўваецца ў рукапісным фондзе бібліятэкі Акадэміі навук Літоўскай ССР, ВБФ, 603).

Беларуская літаратура ў даўгу перад іспанскаю тэмай, і гэты нясплачаны доўг паказальны. Ён — лішні доказ запушчанасці гістарычнага жанра, пра што многа гаварыла наша крытыка.

Ул. КАЛЕСНІК,
выкладчык Брэсцкага педагагічнага інстытута.

З ПАРТЫЙНЫХ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧЫХ СХОДАЎ

У Саюзе пісьменнікаў

31 кастрычніка адбыўся справаздачна-перавыбарчы сход партарганізацыі СП БССР. З дакладам выступіў сакратар партбюро М. Ткачоў. Ён адзначыў, што за справаздачны перыяд партыйная арганізацыя ўзмацніла выхаваўчую работу сярод пісьменнікаў. Многія з іх паспяхова працавалі над новымі раманамі, аповесцямі, паэмамі, п'есамі, у якіх праўдзіва адлюстроўвалі нашу рэчаіснасць.

Разам з тым дакладчык адзначыў, што ў друк трапляюць яшчэ шэрыя, пасрэдныя творы, якія не задавальняюць чытачоў.

У спрэчках па дакладу выступілі **М. Хведаровіч, А. Слесарэнка, П. Пестрак, А. Есакоў, А. Бачыла, Я. Шарахоўскі, П. Кавалёў, П. Броўка.** Яны зрабілі рад слушных заўваг у адрас партыйнага бюро. Амаль у кожным выступленні адчувалася законнае нездавальненне дзейнасцю Дзяржаўнага выдавецтва БССР, якое мала выдае арыгінальнай беларускай мастацкай літаратуры. У многім вінавата тут і праўленне Саюза.

На працягу справаздачнага перыяду комуністы партарганізацыі ўзнімалі рад важных пытанняў, якія маюць актуальнае значэнне для нашай літаратуры. Але многія з іх яшчэ не вырашаны. Да гэтага часу не выпускаецца часопіс для дзяцей дашкольнага ўзросту, не арганізавана літаратурнае выдавецтва, не наладжана як след работа з маладымі пісьменнікамі ў абласных рэспубліках.

На сходзе выступіў загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ **Н. Халіпаў.**

Работа партыйнага бюро за мінулы перыяд прызнана здавальняючай. Абраны новы склад бюро: М. Ткачоў (сакратар), П. Броўка, П. Глебка, І. Гурскі, А. Кулакоўскі, А. Макаёнак, Р. Сабаленка.

У Міністэрстве культуры

Быў час, калі ў Міністэрстве культуры Беларускай ССР не было чуваць голасу радавых супрацоўнікаў. Шмат якія заўвагі і прапановы інспектараў, планавікоў, дыспетчараў сутыкаліся з халоднай роўнадушнасцю, крытыка ўспрыймалася з аглядкай на пасады... Паступова комуністы, члены профсаюзнай арганізацыі, комсамольцы смялей загаварылі пра недахопы, пачалі змагацца супраць усяго, што перашкаджае ісці наперад, супраць рутыны, бюракратызма, зазнайства.

Але не пераваляліся яшчэ ў міністэрстве такія «дзеячы», што на словах стаяць за аператыўнасць, а на справе — супраць яе. Менавіта аб гэтым ішла размова на справаздачна-выбарчым сходзе партыйнай арганізацыі, які адбыўся тут гэтымі днямі.

Міністэрства — штаб культурнага будаўніцтва рэспублікі. Расказваючы аб дзейнасці яго ўпраўленняў і аддзелаў, дакладчык — сакратар партбюро **Ф. Кукушкін** не скупіўся на ружовыя фарбы. Яго справаздача не задаволіла многіх удзельнікаў сходу і сур'ёзна крытыкавалася імі, тым больш, што ў ёй нічога не *гаварылася аб такім* важным аддзеле, як упраўленне па справах мастацтва.

Інспектар аддзела кадраў, комуніст **В. Басалаеў** сказаў, што члены бюро, у тым ліку і Ф. Кукушкін, забыліся на сувязь з масамі, рэдка заглядаюць у аддзелы і таму не ведаюць, як там абстаяць справы.

— У наш аддзел, —гаворыць В. Басалаеў, — паступіла восемсот пісем. Пераважная большасць іх — скаргі і просьбы. Але хто на іх кваліфікавана адкажа, калі нават мы, інспектары, часам не выязджаем для праверкі скаргаў. Жывем як у лесе: каб не прамахнуцца ў ходзе рэагавання, ідзем па кансультацыю ў іншыя міністэрствы.

Комуністы **М. Казлоўскі, П. Кавалеўскі і Л. Іванова** доказна гаварылі аб трывожным становішчы з кадрамі клубных устаноў, тэатраў, музычных школ. Вядома, напрыклад, што ў Мінску ёсць кваліфікаваныя піяністы. Некаторыя з іх яшчэ нідзе не працуюць. Між тым з-за адсутнасці выкладчыкаў у трынаццаці школах рэспублікі не існуе выкладання фартэпіяно.

На думку комуніста **В. Касцюковіча,** істотнай заганай з'яўляецца і тое, што некаторыя аддзелы да гэтага часу працуюць адасоблена, а гэта не дае магчымасці больш мэтанакіравана выкарыстоўваць сродкі, якія асігнаваны на падрыхтоўку клубных устаноў да зімы.

Многа слушных заўваг зрабілі **Л. Каганская** (планавы аддзел), **І. Саснін, Т. Дубаўскоў.** Яны крытыкавалі бюро за тое, што яно аслабіла работу па ідэйна-палітычнаму выхаванню калектыву, прапанавалі часцей чытаць лекцыі і даклады для работнікаў міністэрства.

Падтрымаўшы іх, міністр культуры **Г. Кісялёў** падкрэсліў, што канкрэтная размова аб недахопах — сведчанне ўзросшай патрабавальнасці комуністаў. Трэба, каб гэтая патрабавальнасць лягла ў аснову практычнай дзейнасці ўсіх супрацоўнікаў міністэрства.

У склад новага партбюро абраны Ф. Кукушкін (сакратар), С. Габрылян, В. Касцюковіч, Г. Кісялёў, І. Красоўскі, А. Цітоў.

Таленавітыя спявачкі

Спяваць Ніна пачала яшчэ з маленства. Выйдзе яна бывала на маляўнічы бераг ракі Арэсы і заспявае любімыя песні. Ідуць жанчыны па ваду, стануць і слухаюць Ніну.

— Быць табе артысткай,—гаварылі ёй людзі.

Невядома, можа і спраўдзіліся-б іх словы, але пачалася вайна. Стала не да песень. Бацька пайшоў на фронт, дзе загінуў у баях супраць фашысцкіх захопнікаў. Гэтая цяжкая вестка падарвала здароўе маці Ніны. Яна захварэла і неўзабаве памерла, пакінуўшы трое малых дзяцей.

Радзіма паклапацілася аб дзецях-сіротах. Неўзабаве Ніна, яе брат і сястра былі адпраўлены ў Луцкі дзіцячы дом. Там Ніна закончыла восем класаў, пасля адзін год працавала пераплётчыцай у друкарні горада Мазыра, а пазней паступіла вучыцца ў Шчучынскі зоатэхнікум. Але не магла пакінуць сваё другое прызванне—сцэну. Яна запісалася ў гурток мастацкай самадзейнасці пры зоатэхнікуме, а праз некаторы час—у харавы гурток Шчучынскага раённага дома культуры.

Усе вольныя ад вучобы гадзіны аддавала Ніна рабоце гуртка. Развучвала новыя песні, частушкі. У тэхнікуме яна пазнаёмілася з другой удзельніцай самадзейнасці — Зояй Шугай. Паспрабавалі спяваць разам —атрымліваецца. Ніна і Зоя неразлучныя цяпер не толькі ў вучобе, але і на сцэне. Спяваюць яны добра. У іх рэпертуары звыш 30 песень, частушак і арый з опер. Асаблівым поспехам карыстаюцца сатырычныя частушкі, якія нярэдка Ніна з Зояй складаюць самі. У іх яны востра высмейваюць гультаёў, бюракратаў, п'яніц. Бывае, што ў час выканання такіх частушак многія пазнаюць сябе і пакідаюць залу...

У гэтым годзе Ніна Жудро і Зоя Шугай былі ўдзельніцамі абласнога агляду мастацкай самадзейнасці. Члены журы з цікавасцю праслухалі частушкі і адзначылі высокае майстэрства іх выканаўцаў, а абласное ўпраўленне культуры ўзнагародзіла Зою і Ніну Ганаровымі граматамі.

В. ФЯДОТАЎ.

ПАЧЭСНЫ ШЛЯХ

Дзве невялічкія шыльды пабачыў пад'езду гавораць, што знаходзіцца за яго вялізнымі дзвярыма. Зойдзем у сярэдзіну гэтага цудам уцалелага ў час вайны будынка. Пераступіўшы парог, вы адчуваеце па гуках, што трапілі не ў звычайную ўстанову. Мінскае музычнае вучылішча. Гадзіна пасля сканчэння яго студэнтаў разышлася працаваць кіраўнікамі хоў мастацкай самадзейнасці, выкладчыкамі ў музычных школы (а іх багата цяпер у Беларусі), музыкантамі.

Больш здольныя, таленавітыя паднімуцца ў гэтым-жа будынку на трэці, чацвёрты паверхі — паступяць у Беларускую дзяржаўную кансерваторыю.

Звыш двухсот студэнтаў навучаецца на шасці факультэтах кансерваторыі. Кожны з іх ішоў сюды сваёй сцяжынкай, падчас пакручастай, з перашкодамі, але гэтыя сцяжынкі ўсе разам утварылі потым шырокі шлях развіцця здольнасцей.

Вось перад намі студэнт другога курса па класу віяланчэлі Мадорскі Станіслаў Сціплы ў жыцці, працавіты ў вучобе, актыўны ў грамадскай працы, ён расказвае нам сваю не багатую жыццёвым вопытам, але характэрную для *нашых совецкіх студэнтаў* біяграфію.

Маці яго працуе прыбіральшчыцай на абутковай фабрыцы ў Гомелі. Бацька загінуў на вайне. Не было адкуль чакаць дапамогі ў вучэнні, і маці часта напамінала:

— Вучыся, сынок, старайся, спадзявайся на сябе.

І Станіслаў вучыўся настойліва, выконваў заданні са шчырасцю, з ахвотай. Не раз ён глядзеў з дзіцячай зайздрасцю на тых, хто ўмеў іграць на скрыпцы, і ў душы сваёй выношваў думку стаць такім-жа музыкантам. Яму было 14 гадоў, калі паступіў у музычную школу. У такім узросце вучні павінны заканчваць яе. І толькі дзякуючы сваім здольнасцям, настойлівасці, стараннасці Станіслаў канчае школу за адзін год. Настаўніцкі калектыў рэкамендуе яго ў музычнае вучылішча. Перад ім стаіць задача: пасля вучылішча — кансерваторыя. Ён ведае — шырока адчыненыя туды дзверы тым, хто мае музычныя здольнасці, хто стараецца авалодаць ведамі на кожным кроку.

— Я рады, што мае мары збыліся, — гаворыць нам Станіслаў, — і лічу вялікім шчасцем для сябе, што навучае *мяне прафесар Аляксандр Паўлавіч Стагорскі,* надзвычай чулы і патрабавальны чалавек.

Зусім па-іншаму абудзілася любоў да музыкі ў першакурсніцы Бенігны Пяткевіч. З дзіцячых гадоў яна пачала займацца ёю. Бацька ўмеў іграць на гармоніку-трохрадцы і зацікавіў музыкай дзяцей. Нотнай граматы бацька не ведаў. Прыходзілася дзецям разлічваць на слых.

— Тата праігрываў на гармоніку якую-небудзь мелодыю, а мы, дзеці, павінны былі спачатку праспяваць яе, а пасля праіграць на сваіх інструментах, — успамінае цяпер Бенігна. — Трэба было ўлавіць самыя тонкія адценні мелодыі, *каб не сфальшывіць пры паўтарэнні.* А слых у таты — надзвычайны, ён адразу заўважаў няправільнасць перадачы. І нам — мне і траім братам — нялёгка было ў першыя часы. Калі памыляўся хто з нас, тата цярпліва паўтараў зноў, і так да таго часу, пакуль не выходзіла дакладна.

З шасці гадоў Бенігна пачала вучыцца іграць на балалайцы, затым на мандаліне, а пазней на скрыпцы. Будучы ў пятым класе сямігодкі, яна арганізавала школьны струнны гурток, у якім займалася дзесяць вучняў. На школьных вечарах, у калгасным клубе Дрысвят, адкуль родам Бенігна і дзе бацькі яе і цяпер жывуць і працуюць у калгасе, гурток меў вялікі поспех. А пазней, пры ўдзеле настаўнікаў, арганізоўваюцца ў дапамогу струннаму гуртку харавы і танцавальны. Цяпер ужо можна было наладжваць канцэртныя вечары.

У 1951 годзе Бенігну выбралі сакратаром первічнай комсамольскай арганізацыі. З ахвотай працавала яна на гэтай рабоце. Працавала і вучылася, вучылася і марыла аб *музыцы, хацелася авалодаць* майстэрствам музычнай справы, бо адчувала, што не хапае ёй гэтага.

Прынятая на аддзяленне народных інструментаў па класу домры, Бенігна ўжо з другога курса вучылішча выносіць сваю грамадскую працу за сцены навучальнай установы — яна арганізоўвае два струнныя гурткі і кіруе імі. А з трэцяга курса пачынае працаваць у філіяле Мінскай музычнай школы пры калгасе імя Гастэлы, дзе выкладае і цяпер. Шчыра, з ахвотай яна перадае свае веды калгасным дзецям.

— Бывала, часам — браты і я — з'едземся разам бацькоў наведаць і такі наладзім сямейны канцэрт, што ўсе суседзі сыйдуцца паслухаць, — кажа Бенігна. — Радуецца тады бацькава, матчына сэрца: знайшлі іхнія дзеці дарогу ў жыцці.

Сянюк Раіса — мінчанка. Бацька яе інвалід Айчыннай вайны, працуе сталяром. Другі год вучыцца яна ў кансерваторыі на гістарычна-тэарэтычным факультэце. Яшчэ ў сямігодцы Раіса паставіла сабе за мэту авалодаць музычнай справай, стаць яе выкладчыкам. Любоў да музыкі *абудзілася ў яе* зусім нечакана. Як гэта здарылася, Раіса не можа добра прыпомніць, ведае толькі адно: усё больш і больш пачалі захапляць яе розныя мелодыі, потым сама патроху пачала іграць. Як скончыла сямігодку, цвёрда наважыла паступіць у музычнае вучылішча. І не паступіла. Туга агарнула Раісу, раздіваліся мары. Маці нават трошкі задаволена была, бо хацела, каб дачка паступіла ў іншую навучальную ўстанову. Але ўсё-ж гора дзіцяці кранала яе сэрца, і маці ласкава суцяшала:

— Раіска, не бяры надта ў галаву. Ці-ж на гэтым вучылішчы свет клінам сышоўся! Столькі розных тэхнікумаў, выбірай любы па жаданню ды паступай.

Але ў тым вось і справа, што жаданне Раісы было — музычнае вучылішча. У той год яна вучылася ў восьмым класе сярэдняй школы, не трацячы надзеі на дасягненне свае мэты. У наступны год Раіса — студэнтка музычнага вучылішча, а праз чатыры гады перад ёю шырока адчыняюцца дзверы кансерваторыі.

Перад святам Кастрычніцкай рэволюцыі студэнты рыхтуюцца да выступленняў. Столькі святочных вечароў, столькі ўрачыстасці, кожнаму хочацца правесці гэты вечар як найлепш. Прадпрыемствы, установы загадзя клапоцяцца, каб на іх вечарах былі не толькі даклады, але і спевы і музыка. І дзесяткі заявак паступаюць штодзённа. У спісах брыгад, што будуць выступаць на святочных вечарах, мы бачым Станіслава Мадорскага, Бенігну Пяткевіч, Раісу Сянюк.

Народжаная пасля Кастрычніцкай рэволюцыі, узросшая з невялічкага музычнага вучылішча да вышэйшай навучальнай установы, Беларуская дзяржаўная кансерваторыя заваявала сабе пачэснае месца. Сотні яе былых студэнтаў працуюць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

Алесь ПАЛЬЧЭЎСКІ.

На здымку: выкладчык **М. Бергер** і першакурсніца **Л. Мардвіненка** на занятках у класе.

Другі сімфанічны канцэрт

Сімфанічны канцэрт, які адбыўся ў клубе імя Дзержынскага, паказаў бясспрэчны рост выканаўчай культуры аркестра філармоніі, яго ўзрослае майстэрства.

Новая, арыгінальная праграма з твораў беларускай музыкі і лепшых узораў зарубежнай класікі выклікала жывую цікавасць слухачоў. Яны пазнаёміліся з другой сімфоніяй Р. Пукста, канцэртам для віяланчэлі і аркестра Сен-Санса, урыўкамі з драматычнай легенды «Асуджэнне Фаўста» і увертюрай «Рымскі карнавал» Г. Берліёза.

З вялікай увагай праслухалі прысутныя выкананне сімфоніі Р. Пукста. Музыка гэтага цудоўнага па сваёй напеўнасці твора глыбока звязана з беларускай народнай песняй, з паэтычнымі вобразамі прыроды і быту роднага краю. Мелодыка ад першага да апошняга такта прасякнута песеннасцю, гоманам беларускіх палёў і лясоў.

Другая сімфонія належыць да ліку лепшых твораў кампазітара і многа разоў выконвалася па радыё і ў канцэртах у Мінску, Маскве, Кіеве, Одэсе і іншых гарадах. Аднак нам здаецца, што на гэты раз яна была выканана найлепшым чынам. Малады, таленавіты дырыжор В. Дуброўскі, які з поспехам выканаў у мінулым канцэртным сезоне Чацвёртую сімфонію М. Аладава і выдатна правёў першы канцэрт новага сезона, старанна развучыў партытуру сімфоніі Р. Пукста і з любоўю данёс да слухачоў яе змест. Асабліва чула была раскрыта другая павольная частка сімфоніі, якая стварае вобразы шчырай і задушэўнай лірыкі, авеянай смуткам і марай.

Яркім кантрастам прагучала трэцяя частка — скерцо. Аднак больш жывы тэмп выканання дадаў-бы гэтай частцы гуллівасць і вастрыню. Многа зрабіў дырыжор для таго, каб добра прагучаў фінал, які менш удаўся кампазітару. Трэба сказаць, што не толькі В. Дуброўскі, але і ўвесь аркестр шмат працаваў над тым, каб найлепшым чынам данесці твор да слухача. Самабытная і свежая па сваёй мелодыі сімфонія Р. Пукста, нягледзячы на недахопы формы і інструментоўкі, пакінула добрае ўражанне ў слухача.

У другім аддзяленні выдатна прагучаў канцэрт для віяланчэлі і аркестра Сен-Санса. Ігра Д. Шафрана захапіла аўдыторыю сваім віртуозным бляскам і пранікнёнай лірычнай цеплынёй. У выкананні адчуваліся тая лёгкасць, прастата і шчырасць, якія ўласцівы сапраўдным артыстам. Цудоўная кантылена, яркасць рысунка, майстэрскае валоданне легато, закончанасць фразіроўкі — характэрныя асаблівасці ігры гэтага майстра.

Аркестр быў вартым партнёрам саліста і дапамог раскрыць жывы, аптымістычны змест канцэрта. Валодаючы тонкім мастацкім густам і пачуццём стылю, В. Дуброўскі вельмі ўдала выявіў задуму кампазітара.

Дырыжор і аркестр многа зрабілі, каб паказаць усю маляўнічасць і тэмбравае багацце ўрыўкаў з драматычнай легенды Берліёза («Ракоці-марш» і «Танец сільфаў»). Аднак з-за недастатковай зладжанасці ў духавой і асабліва ў драўлянай групах аркестра, ўражанне ад цудоўных тэмбравых і гукавых дасягненняў Берліёза ў «Ракоці-маршы» зменшылася. Разам з тым нельга не адзначыць тонкае выкананне дырыжорам і аркестрам прыгожага малюнка танца.

У выкананні «Рымскага карнавала» праявіліся яркі тэмперамент В. Дуброўскага, яго добрае валоданне рытмам і формай твора. Дырыжор пераканальна перадаў мэтаімкнёнасць сімфанічнага развіцця увертюры. Гэта асабліва важна таму, што музыка Берліёза вызначаецца сваёй строгай, крыштальнай формай. Аркестр з уздымам і захапленнем выканаў увертюру.

Хочацца верыць, што канцэртны сезон прынясе слухачам Мінска яшчэ нямала прыемных уражанняў.

Б. СМОЛЬСКІ.

Абмеркаванне першага сімфанічнага канцэрта

29 кастрычніка Беларуская дзяржаўная філармонія наладзіла абмеркаванне першага сімфанічнага канцэрта, якім адкрыўся ў Мінску канцэртны сезон 1956—1957 гг.

Перад абмеркаваннем былі праслуханы ў запісу на плёнку Пятая сімфонія Чайкоўскага і сімфанічная паэма Р. Штрауса «Тыль Уленшпігель».

Ва ўступным слове кампазітар Я. Цікоцкі падкрэсліў, што адкрыццё канцэртнага сезона выклікала рад выступленняў у друку. Гаворачы ў прыватнасці пра артыкул І. Нісневіча «Першы сімфанічны канцэрт», змешчаны ў газеце «Літаратура і мастацтва», Я. Цікоцкі адзначыў, што аўтар артыкула правільна ўказвае на некаторыя недахопы канцэрта, аднак выклікае пярэчанне тон, якім пра ўсё гэта гаворыцца. Я. Цікоцкі не пагаджаецца з трактоўкай, якую І. Нісневіч дае Пятай сімфоніі Чайкоўскага, і заўважае, што ў артыкуле не падкрэслена галоўнае — важнасць падзеі. Прамоўца адзначае недахопы канцэрта — неадналькава добрае гучанне паасобных тэм і пэўную невыразнасць фіналу ў сімфоніі.

Затым слова ўзяў дырэктар філармоніі П. Левашоў. Яго выступленне надало сходу кірунак, які прывёў фактычна да абмеркавання толькі артыкула І. Нісневіча.

Цікавым і змястоўным было выступленне галоўнага дырыжора філармоніі В. Дуброўскага, які, адзначыўшы нездавальняючы стан нашай музычнай крытыкі, адстайваў правільнасць сваёй трактоўкі сімфоніі. Зрабіўшы экскурс у гісторыю творчасці Чайкоўскага, прамоўца падкрэсліў, што кампазітар у дадзеным творы не мог абмежавацца цалкам лікуючым фіналам, «амажорыў» у фінале тэму лёсу. Недахопы артыкула І. Нісневіча В. Дуброўскі бачыць у тым, што аўтар ужывае безапеляцыйны тон, а таксама не заўсёды глыбока разумее партытуру твора.

У сваім выступленні І. Нісневіч абгрунтоўваў права крытыка на сваё тлумачэнне твора. Ён лічыць нармальным, калі ў музычнай крытыцы існуюць розныя пункты погляду.

Аб неабходнасці паяўлення вострых артыкулаў гаварыў Г. Анчыкаў. Вельмі слушнай была яго заўвага аб тым, што пра недахопы канцэрта на сходзе гаварылася выключна ў памяншальнай форме, што праходзіць міма паасобных творчых недахопаў на такой нарадзе не варта было.

На сходзе выступілі Э. Фарбераў, Б. Скабло, А. Розенман, Б. Афанасьеў і іншыя.

Сумардзі. Партрэт.

★★★

Праз тры дні ў Мінску закрываецца выстаўка творчасці мастакоў Інданезіі. Кожны дзень сюды прыходзілі ўсё новыя і новыя наведвальнікі. І гэта зразумела. Многія творы жывапісу сучасных мастакоў прысвечаны жыццю інданезійскага народа, расказваюць аб чароўных, маляўнічых мясцінах далёкай краіны. На выстаўцы экспануюцца работы майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: скульптура, разьба па дрэву, мастацкая тканіна. Усе гэтыя работы сведчаць аб высокім майстэрстве народных умельцаў — стваральнікаў маладога мастацтва Інданезіі. І таму яшчэ бліжэй становіцца да беларускага гледача гэты таленавіты і мужны народ, які толькі 11 гадоў назад вызваліўся ад векавога каланіяльнага прыгнёту.

★ ★

Афандзі. Танцор.

Квартэт Влаха ў Мінску

Квартэт Влаха — малады калектыў, створаны шэсць год назад. Яго ўдзельнікі — артысты аркестра Пражскага нацыянальнага тэатра: Іёзеф Влах (першая скрыпка), Вацлаў Снітыл (другая скрыпка), Іёзеф Кадзёўсек (альт) і Віктар Моучка (віяланчэль).

Творчы шлях калектыву багаты падзеямі, сустрэчамі, цікавай канцэртнай дзейнасцю. За гады сваёй работы квартэт выступаў перад шматлікімі слухачамі на радзіме, а таксама ў многіх іншых краінах. Дастаткова назваць Бельгію, Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, Швейцарыю, Грэцыю, Іран, Поўднёвую Афрыку, каб мець уяўленне аб вялікім размаху канцэртнай дзейнасці чэхаславацкіх артыстаў і аб тысячах слухачоў, якія віталі іх выдатнае майстэрства.

Другі тыдзень госці гастралююць у Совецкім Саюзе. Паказаўшы сваё майстэрства масквічам і ленінградцам, квартэт прыехаў у Мінск. Выдатная тэхніка, тонкая нюансіроўка, бездакорная апрацоўка кожнага твора, а галоўнае—ідэальны ансамбль, сыгранасць — вось што характарызуе калектыў. Рэпертуар вялікі і рознастайны, музыканты іграюць творы розных эпох і напрамкаў. І вельмі важна тое, што квартэт тонка і пранікнёна перадае стыль твораў, іх змест.

У гэтым лёгка было пераканацца, наведаўшы канцэрт. У яго праграму ўвайшлі квартэты Гайдна, Іша Крэйчы і Антаніна Дворжака.

Лёгка, свабодна быў сыграны квартэт Гайдна. У другой, павольнай частцы артысты паказалі прыгажосць гучання сваіх інструментаў, у менуэце — прыгажосць і грацыёзнасць, а ў хуткіх частках — бліскучую тэхніку.

Тое-ж можна сказаць і аб выкананні квартэта Іша Крэйчы. Гэты твор буйнага сучаснага чэшскага кампазітара карыстаецца ў выкананні квартэта Влаха вялікай папулярнасцю. Энергічная першая частка, спакойная другая, невялікае, прыгожае канцэрціно, рэчытатыў, у якіх кампазітар даў выразныя соло альта і віяланчэлі і, нарэшце, хуткі фінал танцавальнага характару, — усё гэта прагучала на высокім прафесіянальным узроўні.

Квартэт Антаніна Дворжака ў чатырох частках, сыграны ў другім аддзяленні канцэрта, належыць да найбольш складаных твораў кампазітара. Аднак і з ім квартэт Влаха справіўся па-майстэрску.

Артысты выканалі некалькі твораў звыш праграмы. Двойчы ім давялося сыграць невялікую п'есу — «Серэнаду» Глюка. «Серэнада» іграецца без смычкоў (піцыкато), тонка, паэтычна, з вялікім густам. Добра прагучалі таксама рондо з квартэта чэшскага кампазітара Крамара і твор Моцарта.

У 1955 годзе ў Льежы адбыўся міжнародны конкурс струнных квартэтаў, у якім прымалі ўдзел 46 ансамбляў розных краін. У гэтым сур'ёзным спаборніцтве квартэт Влаха заваяваў першую прэмію, атрымаўшы званне лаўрэата міжнароднага конкурсу.

Е. ЯКАЎЛЕВА.

Наш новы сезон

Гомельскі абласны драматычны тэатр пачаў свой трэці сезон.

Увесь калектыў напружана працуе над трыма спектаклямі, якімі ён сустракае слаўную 39-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка. Сезон адкрываецца п'есай класіка сербскай літаратуры Б. Нушыча «Доктар філасофіі» ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра Н. Ульянава. Паралельна з гэтым тэатр працуе над камедыяй В. Кіршона «Цудоўны сплаў» (рэжысёр І. Дуброўскі, афармленне Е. Ясафавай).

Да 7 лістапада будзе падрыхтаваны спектакль па раману І. Шамякіна «Глыбокая плынь» (інсцэніроўка G. Гурыч). Гэтая работа пачалася яшчэ ў мінулым сезоне і цяпер заканчваецца. У дні святкавання гамяльчане ўбачаць на сцэне слаўныя эпізоды барацьбы беларускіх партызан з фашысцкімі захопнікамі ў дні Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым спектаклі заняты ўвесь творчы калектыў.

Да канца года будуць паказаны яшчэ два спектаклі. Першы з іх—для дзяцей—паэтычная казка К. Паустоўскага «Стальны пярсцёнак» і другі—«Каменнае гняздо» Х. Віолуйокі.

Мы мяркуем праводзіць канферэнцыі, выезды на прадпрыемствы і ў калгасы, сустрэчы акцёраў з рабочымі, служачымі і працаўнікамі калгасных палёў.

Калектыў з вялікім уздымам рыхтуецца сустрэць новымі спектаклямі саракагоддзе совецкай улады.

Б. МАТРОС,
дырэктар Гомельскага тэатра.

Увекавечанне памяці Г. Скарыны

Полацкі горвыканком і гарком КПБ пастанавілі перайменаваць Пролетарскую вуліцу ў г. Полацку ў вуліцу Георгія Скарыны. Яны звярнуліся таксама ў ЦК КПБ і Совет Міністраў БССР з просьбай прысвоіць імя гэтага выдатнага дзеяча беларускай культуры Полацкаму педагагічнаму інстытуту і пабудаваць помнік Г. Скарыну на яго радзіме—у Полацку.

ХРОНІКА КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

ПАМЯЦІ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ

27 кастрычніка ў памяшканні тэатра імя Янкі Купалы адбыўся юбілейны вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння і 15-годдзю з дня смерці выдатнага беларускага пісьменніка Змітрака Бядулі.

З дакладам аб жыцці і творчасці пісьменніка выступіў А. Кучар.

Пасля быў паказаны спектакль «Салавей» у пастаноўцы тэатра імя Я. Купалы.

ЮБІЛЕЙ УНІВЕРСІТЭТА

Споўнілася 35 год з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага універсітэта. За гэтыя гады ў буйнейшай навучальнай установе рэспублікі атрымалі вышэйшую адукацыю шмат юнакоў і дзяўчат. Толькі ў гэтым навучальным годзе на розныя факультэты універсітэта было прынята каля двух тысяч студэнтаў.

НОВЫЯ КУЛЬТАСВЕТУСТАНОВЫ

Добры падарунак атрымалі напярэдадні свята жыхары Гродна—чытальную залу ў абласной бібліятэцы. Гэта светлы і прасторны пакой, разлічаны на сто месц.

Новы аддзел адкрыўся ў Рэчыцкім краязнаўчым музеі. У ім сабраны экспанаты-дакументы аб барацьбе насельніцтва супраць акупантаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Падарунак атрымалі і маленькія жыхары Варашылаўскага раёна г. Мінска. Тут пачала працаваць дзіцячая бібліятэка. Кніжны фонд новай культасветустановы складаецца з дзесяці тысяч кніг. Сярод іх — лепшыя творы беларускіх і рускіх пісьменнікаў.

КНІЖНЫ МАГАЗІН НА ІЛЬНОКАМБІНАЦЕ

На ніжнім паверсе новага жылога дома, пабудаванага ў пасёлку Аршанскага ільнокамбіната, адкрыты кніжны магазін. На яго паліцах — вялікі выбар мастацкай, палітычнай і тэхнічнай літаратуры, падручнікаў, канцылярскіх прылад, рэпрадукцый з карцін рускіх і совецкіх мастакоў.

Штодзённа ў новым магазіне можна сустрэць многіх тэкстыльшчыкаў, студэнтаў вячэрняга тэхнікума, школьнікаў.

ДАЎНІЯ СЯБРЫ

Як жаданых гасцей сустрэлі калгаснікі сельгасарцелі імя Тэльмана Мінскай вобласці брыгаду артыстаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балету. З вялікай і цікавай праграмай выступілі перад хлебаробамі народны артыст СССР М. Ворвулеў, народныя артысты БССР Л. Ражанава, М. Зюванаў, заслужаныя артысты БССР В. Міронаў, М. Шэхаў, артысты А. Карзянкова, В. Глушакоў і іншыя.

Гэта чацвёрты выезд артыстаў опернага тэатра ў калгас імя Тэльмана.

САМАДЗЕЙНЫЯ КАМПАЗІТАРЫ ВІЦЕБСКА

Рыхтуючыся да фестывалю совецкай моладзі, абласны Дом народнай творчасці правёў трохдзённы семінар кампазітараў вобласці. Абмеркаваны творы студэнта музычнага вучылішча Б. Магаліфа, электраманцёра Г. Шадурскага, выхавацеля Лепельскай школы-інтэрната А. Пятрэнкі, метадыста культбазы аблпромсовета А. Шалк і іншых.

Станоўчую ацэнку атрымалі «Фестывальная песня» В. Смірнова на словы маладога паэта Ю. Доктарава, «Люблю лугі квяцістыя» Г. Шадурскага на словы А. Русака, «Вясенняя песня» А. Шалк і інш.

На семінары абмеркавана 36 твораў самадзейных кампазітараў.

СУСТРЭЧА З СУПРАЦОЎНІКАМІ АРХІВАЎ

Гэтымі днямі ў памяшканні клуба Саюза пісьменнікаў БССР адбылася сустрэча літаратараў з супрацоўнікамі дзяржаўных архіваў рэспублікі. Прысутныя з цікавасцю праслухалі выступленні Г. Елісеевай (Мінск), Г. Шапкінай (Гродна), Т. Ліберуўскай (Брэст) і іншых. Яны паведамілі аб складзе і змесце дакументальных матэрыялаў і новых дакументах, выяўленых за апошні час.

Да сустрэчы была арганізавана выстаўка. Сярод экспанатаў увагу прыцягнулі часопісы «Полымя», «Узвышша», «Адраджэнне», выдадзеныя ў 1922—24 гадах, дакументы аб знаходжанні Чаадаева, Кюхельбекера і Маякоўскага ў Беларусі, рэдкія фотаздымкі дзеячоў Комуністычнай партыі, урада, работнікаў літаратуры і мастацтва.

СВЯТОЧНЫЯ НУМАРЫ ЧАСОПІСАЎ

ПОЛЫМЯ

«Уся ўлада Советамі»—так называецца драматычная паэма М. Клімковіча, якой адкрываецца нумар часопіса. Паэма расказвае аб падзеях Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі.

Раздзел паэзіі прадстаўлены новымі вершамі Я. Непачаловіча, С. Гаўрусёва, А. Звонака і М. Хведаровіча. З празаічных твораў друкуецца аповесць Р. Сабалеўскі «Юнацтва ў дарозе».

У раздзеле публіцыстыкі і крытыкі—артыкулы: «З гісторыі барацьбы большэвікоў Беларусі і Заходняга фронта за перамогу Кастрычніка» — П. Кругліка, пра некаторыя пытанні сучаснай беларускай драматургіі—А. Сабалеўскага, аб праблеме народа ў цыкле апавяданняў А. М. Горкага «Па Русі»—В. Захарава.

З рэцэнзіяй на зборнікі аднаактовых п'ес Ул. Няфёда, В. Зуба і А. Махнача ў нумары выступае М. Модэль. І. Кудраўцаў рэцэнзіруе манаграфію Л. Арабей пра жыццёвы і творчы шлях Цёткі.

БЕЛАРУСЬ

Аб працоўных справах, якімі совецкія людзі сустракаюць свята Кастрычніка, расказваюць многія матэрыялы лістападаўскага нумара часопіса.

Жыццёваму шляху майстра мінскіх чыгуначных майстэрань у дарэвалюцыйны час і мадэльшчыка станкабудаўнічага завода імя К. Е. Варашылава ў гады совецкай улады—І. П. Голубева прысвечаны нарыс Б. Антонава «Тры пакаленні». Фотанарыс В. Сняжкова і М. Мінковіча знаёміць чытача з будаўніцтвам Васілевіцкай ДРЭС.

У Цэнтральным дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і социялістычнага будаўніцтва БССР выяўлены новыя ленінскія дакументы, якія раней не публікаваліся і не ўвайшлі ў Зборы твораў В. І. Леніна. Гэта галоўным чынам тэлеграмы, прысланыя ў розныя ўрадавыя ўстановы Беларусі. Часопіс расказвае аб тэлеграме, накіраванай В. І. Леніным у ліпені 1920 г. Мінскай губернскай харчовай камісіі аб нарыхтоўцы прадуктаў для Чырвонай Арміі, знаёміць чытача з тэлеграмай, атрыманай старшынёй Мінскага губвыканкома ў чэрвені 1921 г. аб паляпшэнні работы Статыстычнага бюро і іншымі ленінскімі дакументамі.

Часопіс друкуе артыкулы: аб творчасці З. Бядулі, аб падрыхтоўцы беларускіх мастакоў да 40-годдзя совецкай улады, аб творчай паездцы артыстаў Беларускага тэатра юнага гледача да хлебаробаў Кустанайшчыны, аб будаўніцтве ў Віцебску ў шостай пяцігодцы і інш.

Шырока прадстаўлены ў нумары жанр нарыса. Г. Шчарбатаў расказвае аб працы трыццацітысячніка, старшыні калгаса на Піншчыне А. С. Дразда. Людзям калгаса «Перамога» Мірскага раёна прысвечаны нарыс М. Ракітнага. Пра свае ўражанні ад падарожжа вакол Еўропы на цеплаходзе «Пабеда» расказвае ў фотанарысе В. Панамароў.

Часопіс друкуе «Апавяданне пра мужнае сэрца» Ус. Краўчанкі, урывак з аповесці Ул. Шахаўца «Пасля вяселля», апавяданне вершам Д. Осіна «Сястра Днепрагэса» ў перакладзе К. Кірэенкі.

У нумары чытач знойдзе рэцэнзію А. Сідарэнкі на першы том успамінаў пра В. І. Леніна, падрыхтаваны Інстытутам марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС і выпушчаны Дзяржаўным выдавецтвам палітычнай літаратуры, а таксама рэцэнзію Ул. Бойкі на зборнік апавяданняў М. Рэкітнага «Вячэрнія зоры».

СОВЕТСКАЯ ОТЧИЗНА

Часопіс заканчвае друкаванне новага рамана А. Міронава «Добры дзень, мораі», змяшчае апавяданні—Я. Брыля «Сірочы хлеб» у перакладзе А. Астроўскага і І. Грамовіча «Рына-Марына» ў перакладзе Ул. Жыжэнкі.

Вельмі цікавымі з'яўляюцца матэрыялы, якія друкуюцца ў раздзеле «Дакументы і ўспаміны». Тут часопіс публікуе пісьмы А. Фадзеева беларускім пісьменнікам М. Паслядовічу, І. Мележу і П. Пестраку.

У раздзеле паэзіі—пераклады вершаў К. Буйлы, а таксама вершы маладых паэтаў М. Кулінковіча, А. Сімарына і Я. Абрамовіча.

Пытанням беларускай мастацкай прозы прысвечаны артыкул А. Адамовіча. З бібліяграфічных матэрыялаў змяшчаюцца рэцэнзіі: І. Скапарава на кнігу вершаў К. Цітова «Шукальнікі» і С. Гаўрусёва на зборнік Н. Кісліка «Размова з сябрамі».

МАЛАДОСЦЬ

Часопіс адкрываецца матэрыяламі, прысвечанымі 39-й гадавіне Кастрычніка.

У нарысе С. Рыгаровіча «Вогненае юнацтва» расказваецца пра ўдзельніка кастрычніцкіх баёў І. Пачатава з Веткаўскага раёна, пра яго сям'ю, выхаваную на традыцыях рэволюцыйнага змагання. Аб барацьбе працоўных былой Заходняй Беларусі за сваё вызваленне апавядае А. Лойка ў нарысе «У бітвах за волю».

«Вуліца Івана Абцэшкі»—так называецца фотанарыс пра маладых будаўнікоў Мінскага аўтазавода. Аб працоўных поспехах калгаснай моладзі расказвае А. Бялевіч у нарысе «Любчанскія мільянеры».

З празаічных твораў у часопісе друкуюцца апавяданні «Ляпіцаў гай» І. Навуменкі і «Юлька» М. Даніленкі.

Паэзія прадстаўлена новымі вершамі А. Александровіча і вершамі маладых паэтаў Я. Пархуты, Г. Бураўкіна і П. Макаля.

Аб творах маладых пісьменнікаў піша Г. Шчарбатаў у артыкуле пра зборнікі «Маленькім сябрам» А. Вольскага, «Ручаінкі» І. Муравейкі і «Бярозавы конь» П. Рунца.

Чытач знойдзе ў часопісе фотанарыс пра Баранавіцкую школу-інтэрнат, гумарэску Т. Жыгалкі «Ахвяры кібернетыкі» і іншыя матэрыялы.

М. СПЕНДЗІЯРАВА.

Светлая дружба

Сёлета спаўняецца 85 год з дня нараджэння выдатнага совецкага кампазітара, народнага артыста Армянскай ССР Александра Афанасьевіча Спендзіярава (1871—1928 гг.).

Кампазітар з'яўляецца аўтарам многіх значных твораў — оперы «Алмаст», «Крымскіх эскізаў» і «Эрыванскіх эцюдаў» для аркестра, сімфанічнай карціны «Тры пальмы», легенды для контральто з аркестрам «Бэда-прапаведнік» (на тэкст Палонскага) і многіх вакальных п'ес.

А. Спендзіяраву належыць шэраг твораў, якія грунтуюцца на армянскай народнай музыцы і знаходзяцца на вельмі высокім узроўні кампазітарскага майстэрства. Характэрныя рысы яго творчага стылю— глыбокі лірызм, светлы настрой, стрыманыя пачуцці, выдатны густ у выкарыстанні гарманічных і інструментальна-тэмбравых сродкаў.

Імя А. Спендзіярава носіць Армянскі дзяржаўны тэатр оперы і балету.

Друкуем урывак з кнігі дачкі кампазітара Марыны Спендзіяравай.

29 сакавіка 1928 года, у дзень 60-годдзя з дня нараджэння М. Горкага і 35-годдзя яго літаратурнай дзейнасці, у Эрывані адбыўся канцэрт. Пад кіраўніцтвам А. Спендзіярава былі выкананы увертюра «Эгмант» Бетховена і балада «Рыбак і фея», напісаная Спендзіяравым на вершы Горкага.

Спендзіяраў быў ужо тады слабым і з хворым сэрцам, але здольнасць горача рэагаваць на з'явы мастацтва не пакідала яго да самай смерці. Юбілейная дата Горкага і балада «Рыбак і фея», створаная ім у 1902 годзе, ускалыхнулі мінулае. Паводле сведчання сына кампазітара, у гэтыя апошнія месяцы свайго жыцця ён часта наігрываў баладу — свой стары і калісьці самы любімы твор — і з захапленнем расказваў навакольным аб дружбе з Максімам Горкім.

Частку ўспамінаў ён паспеў запісаць толькі асобнымі накідамі. Мне ўдалося дапоўніць іх успамінамі асоб, якія прысутнічалі пры сустрэчах.

У 1900 годзе кампазітар А. Спендзіяраў закончыў сваю музычна-тэарэтычную адукацыю. У 1901 годзе ён жыў у Ялце на Екацерынінскай вуліцы (цяпер вуліца Карла Лібкнехта). Ялцінскі дом Спендзіяравых, падобны фасадам на старажытную грэчаскую бібліятэку «Эрэхтэйона» з яе калонамі і карыятыдамі, стаў з таго часу месцам, дзе збіралася ўся руская інтэлігенцыя, якая жыла ў Ялце або знаходзілася ў ёй у час курортнага сезона.

У пачатку 1902 года ў Ялце стала вядома, што ў маёнтку Такмаковых «Олеіз» знаходзіцца Максім Горкі, які ўжо ў той час карыстаўся шырокай славай. Паведамленне выклікала вялікую цікавасць ялцінскага грамадства. Асаблівае ўражанне рабіла тое, што вядомы і прызнаны пісьменнік паходзіў з народа і быў рэволюцыянерам.

У Ялце ў тыя гады жыў урач Александр Нікалаевіч Алексін — друг Горкага. Ён пазнаёміў Спендзіярава з пісьменнікам у канцы студзеня ці ў пачатку лютага 1902 года.

Алексей Максімавіч з жонкай Екацерынай Паўлаўнай жылі ў асабняку, які насіў назву «Нюра». Маладога кампазітара сустрэлі тут вельмі ветліва. У вялікай прыёмнай-сталовай было многа людзей. Спендзіяраў убачыў там студэнтаў і цывільных асоб, апранутых і франтавата і бедна, і так, як гаспадар дома: у рускай кашулі і ботах. Стол, засланы зялёнай цыратай, быў устаўлены ўсялякай ежай: яешня, дарагія віны, закускі, фрукты на прыгожым фарфоры. Як потым успамінаў Александр Афанасьевіч, у гасцінная гаспадара заўсёды былі для ўсіх адчынены дзверы і накрыты стол.

Алексей Максімавіч запрасіў кампазітара ў свой кабінет. Яны спыніліся ля акна, з якога відаць было мора. На зімовым моры быў поўны штыль. Спендзіяраў, які вельмі любіў прыроду, быў захоплены велічным відовішчам. М. Горкі, як піша Спендзіяраў у сваіх успамінах, сказаў яму: «Я не люблю мора ў спакойным стане, бурнае мора мне больш па душы».

Яны гаварылі аб музыцы. Вялікі пісьменнік цікавіўся творчасцю кампазітара. У Горкага былі нейкая прывабная прастата, далікатнасць і пяшчотнасць у абыходжанні з людзьмі, — успамінаў потым А. Спендзіяраў. Александр Афанасьевіч расказаў пісьменніку аб сваіх музычных марах і задумах, аб работах, якія ён ужо напісаў. Выслухаўшы ўважліва, Горкі сказаў: «Я вершы наогул не пішу, але нядаўна саграшыў, напісаў песню ў вершах па валашскай легендзе. Верш пад назвай «Рыбак і фея». Калі знойдзеце цікавым, напішыце музыку».

Спендзіяраў прачытаў верш. Напэўна, змест твора тут-жа выклікаў у яго ўяўленні музычныя вобразы. 6 лютага 1902 года, хутка пасля першай сустрэчы з Горкім, кампазітар піша свайму выдаўцу Беселю: «Распачаў стварэнне балады для баса з аркестрам на неапублікаваны яшчэ верш М. Горкага, які асабіста мне перадаў свой верш».

Паводле ўспамінаў Екацерыны Паўлаўны Пешкавай, А. Спендзіяраў прывёз сваю баладу неўзабаве пасля першага візіту ў Олеіз. Яна памятае, што Алексей Максімавіч сказаў: «Як на дзіва хутка і ўдала ён напісаў!»

У час наступнай сустрэчы кампазітара з М. Горкім доктар Алексін, які валодаў добрым басам, выканаў баладу «Песня аб феі» пад акампанемент аўтара. А. Спендзіяраў вельмі часта наведваў Алексея Максімавіча ў Олеізе. «Я бываў у яго з асалодай,— успамінаў ён потым. — Яго гасціннасць не мела межаў».

У наступныя свае прыезды ў Ялту—у 1903, 1904 і 1905 гг.— М. Горкі пастаянна сустракаўся з А. Спендзіяравым. Ён бываў у яго ў доме на Екацерынінскай вуліцы. Горкі вельмі любіў музыку. Вера Ефімаўна Галубініна, былая дырэктрыса Ялцінскай музычнай школы, у сваіх успамінах адзначае: «Ён умеў нават расчуліцца ад музыкі, нават слёзы на вачах былі. Ён усё паўтараў: «Ах, каб яго чорт узяў, як добра!». Запрашаючы Горкага да сябе, Спендзіяраў па яго просьбе заўсёды наладжваў канцэрты. На адным з гэтых канцэртаў—увосень 1904 года—салістамі Ялцінскага сімфанічнага аркестра быў выкананы квартэт Сmoll Бетховена. З усіх выкананых для яго твораў Горкаму больш за ўсё спадабаўся гэты квартэт.

Горкі любіў Бетховена. Ведаючы аб гэтым, Спендзіяраў, які рэдка дырыжыраваў не сваімі творамі, выканаў для пісьменніка увертюру «Эгмант».

Улетку 1928 года вялікі пісьменнік наведаў Эрывань. Спендзіярава ён ужо не застаў у жывых. З выпадку прыезду пісьменніка быў наладжаны канцэрт у садзе. Пасля канцэрта студэнты кансерваторыі акружылі пісьменніка і пачалі распытваць яго аб Спендзіяраве. Горкі быў яшчэ пад уражаннем ад толькі што пачутай музыкі. Ён сказаў ім: «У вас быў таленавіты кампазітар».

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Кастусь ГУБАРЗВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Янка КАЗЕКА, Барыс ПЯРКОЎСКІ, Рыгор ШКРАБА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефон 3-24-61.

АТ 09456 Друкарня імя Сталіна.